УДК 808.26

С.У. Шакура

Абыгрыванне кампанентаў фразеалагізма як спосаб пабудовы каламбураў*

У п'есах К. Крапівы фразеалагічныя каламбуры будуюцца рознымі спосабамі, у тым ліку і ў выніку семантычных змяненняў фразеалагізма, пры якіх форма яго застаецца традыцыйнай, а закранаецца толькі сэнс. Вылучаюць дзве групы прыёмаў змяненняў фразеалагізмаў[1]: 1) прыёмы, звязаныя з абыгрываннем усяго фразеалагізма ў цэлым і 2) прыёмы, заснаваныя на абыгрыванні асобных яго кампанентаў.

Разгледзім прыёмы другой групы, калі аб'ектам абыгрывання становіцца не ўвесь фразеалагізм, а яго асобныя кампаненты.

1. Выкарыстанне слова з прамым значэннем, агульнага з кампанентам фразеалагізма. Каламбуры, утвораныя такім чынам, найбольш ужывальныя ў п'есах К. Крапівы. У іх слова, тоеснае фразеалагічнаму кампаненту, рэалізуе прамое значэнне: [Гарлахвацкі:] *А было ж раней – Гарлахвацкаму банкеты, Гарлахвацкаму авацыі, Гарлахвацкі мог любога* ***ў бараноў рог скруціць****. І раптам – косткі!* ***Скруці*** *яе, праклятую, калі хочаш.* («Хто смяецца апошнім».); [Зоя Кірылаўна (трасе яго за чупрыну):] *Ты, брат,* ***глядзі ў мяне****.* [Страмілін:] *Ды я і* ***гляджу****. Ніводнай харошай не прапускаю.* («Зацікаўленая асоба».) Камічны эфект каламбураў у прыведзеных прыкладах заключаецца ў тым, што выразы *ў бараноў рог скруціць* і *глядзі ў мяне* рэалізуюць адначасова фразеалагічныя значэнні (адпаведна: *разм.* 'строгасцю, уціскам прымусіць пакарыцца, падпарадкавацца' і 'выказванне перасцярогі і пагрозы') і свабодныя. Актуалізатарамі прамога значэння выразаў з'яўляюцца агульныя з фразеалагічнымі кампанентамі словы *скруці* (граматычная форма закончанага трывання загаднага ладу) і *гляджу* (граматычная форма незакончанага трывання абвеснага ладу цяперашняга часу). У другім прыкладзе «сапраўдны» сэнс слова *гляджу* раскрываецца ў постпазіцыйным кантэксце-канкрэтызатары (*Ніводнай харошай не прапускаю*), ад чаго камізм выказвання ўзмацняецца яшчэ больш.

Асабліва камічна насычанымі з'яўляюцца каламбуры, у якіх слова, агульнае з кампанентам фразеалагізма, выклікае сталыя вобразныя асацыяцыі: [Левановіч:] *У выніку гэтага даклада перад намі ва ўсёй прыгажосці ўстаў вобраз свінячага маманта. Гэта дапатопная жывёліна аказалася вельмі жывучай, і некаторыя яе экземпляры дажылі аж да нашага часу. Жывёліна гэта хоць і рэдкая ў нас, але надзвычай шкодная. Калі яе не* ***ўзяць за жабры*** *– добра, што* ***жабры*** *ёсць у яе, – калі не ўзяць за гэтыя* ***жабры****, дык такі свінтус грандыёзус можа шмат шкоды нарабіць.* («Хто смяецца апошнім».) У аснове каламбура – сутыкненне фразеалагізма *ўзяць за жабры* (*разм. іран.* 'прымусіць паступаць пэўным чынам') і слова *жабры* ('органы дыхання рыб і

---

* На матэрыяле п'ес К. Крапівы.

[1] Стылістычныя прыёмы творчага выкарыстання фразеалагізмаў (структурна-семантычныя і семантычныя змяненні) упершыню падрабязна і сістэматызавана разгледжаны ў манаграфіях І.Я. Лепешава [4, с. 33–128; 2, с. 120–173] і ў яго навучальным дапаможніку [3, с. 220–233]; гл. таксама: [1, с. 63–73], [5, с. 34–44], [6, с. 9–12].

некаторых іншых водных жывёлін'), у выніку чаго ажывае ўнутраная форма фразеалагічнай адзінкі, актуалізуецца яе першаснае значэнне. Постпазіцыйнае паўторнае ўжыванне фразеалагізма з уключэннем у яго склад займенніка *гэтыя* ўзмацняе іранічны эфект. У пададзеным вышэй прыкладзе каламбур выконвае важную функцыю – дапамагае стварэнню вобраза «свінтуса гандыёзуса», аднак не ў прамым сэнсе 'вялізная дапатопная жывёліна з жабрамі', «адкрытая» ілжэвучоным Гарлахвацкім, а ў пераносным – 'носьбіт шкодніцтва, невуцтва, нахабнасці'.

Адметна ствараецца каламбур і ў наступным прыкладзе: [Гарлахвацкі:] *Трэба абдумаць, за што раней* ***узяцца***. [Анна Паўлаўна:] ***За розум вазьміся.*** *У цябе ж нейкае пасведчанне ёсць, што ты вучоны. Дык і дабівайся па вучонай лініі.* («Хто смяецца апошнім».) Супрацьпастаўленне слова свабоднага ўжывання *ўзяцца* і фразеалагічнага кампанента *вазьміся* (граматычная форма закончанага трывання загаднага ладу дзеяслова *ўзяцца*) садзейнічае дэфразеалагізацыі фразеалагізма *за розум вазьміся* (*разм.* 'прыдумай што-н., знайдзі які-н. выхад'), у выніку чаго ён успрымаецца сінкрэтычна: адначасова як устойлівае і як свабоднае словазлучэнне.

2. Канкрэтызацыя значэння аднаго ці больш кампанентаў фразеалагізма. Калі канкрэтызуецца семантыка фразеалагічных кампанентаў, то ім вяртаецца першапачатковае значэнне або яны арыгінальна пераасэнсоўваюцца. У выніку гэтага заўсёды дасягаецца пэўны стылістычны эфект, часцей за ўсё камічны, які будуецца на ўспрыманні фразеалагізма з вобразным (ідыяматычным) значэннем і прамым (нефігуральным). Найчасцей прыём канкрэтызацыі выкарыстоўваецца ў дыялогу, калі ў першай рэпліцы актуалізуецца несвабоднае значэнне слоў, а ў другой удакладняюцца асобныя кампаненты фразеалагізма. Адна з умоў канкрэтызацыі значэння кампанентаў – адзін персанаж ужывае фразеалагізм з шырокай абагульнена-пераноснай семантыкай, а другі пачынае, звычайна жартам, «канкрэтызаваць» асобныя яго часткі: [Юля:] *А жыве ён...* ***супроць ліха на ўзгорачку.*** [Гудовіч:] *Ну, гэта, відаць, далекавата.* ***Ліха****-то я ведаю дзе, а вось* ***узгорачак*** *той... Без вас я туды не патраплю.* («З народам».) Пры канкрэтызацыі кампанентаў *ліха* і *ўзгорачак* фразеалагізма *супроць ліха на ўзгорачку* (*разм.* 'вельмі далёка') аднаўляецца яго ўнутраная форма, у выніку чаго ён успрымаецца з ідыяматычным і прамым значэннем.

Часам суразмоўнік «падхоплівае» кампанент фразеалагізма, каб унесці папраўку ў пачутае выказванне, і іранічна пераасэнсоўвае яго: [Жлукта:] *А прызнайцеся, з кім гэта вы натхнення набіраліся?* [Праменны:] *Ды вось –* ***на лоне прыроды.*** [Жлукта:] *А ці не было тут яшчэ якога-небудзь* ***лона****?* [Праменны:] *Вас гэта вельмі цікавіць?* [Жлукта:] *Вельмі. Справа ў тым, што да гэтага* ***лона*** *я таксама маю некаторае дачыненне.* [Праменны:] *Напрыклад?* [Жлукта:] *Злыя языкі гавораць, што вы заляцаецеся да мае жонкі.* («Мілы чалавек».) У прыведзеным прыкладзе каламбурна абыгрываецца фразеалагізм *на лоне прыроды* ('на адкрытым паветры, сярод прыроды'). Пытанне персанажа (*А ці не было тут яшчэ якога-небудзь* ***лона****?*), арыентаванае на прамое значэнне фразеалагічнага кампанента *лона* (*уст.* 'грудзі ці чэрава як сімвал мацярынства, пяшчоты, ласкі'), пазбаўляе фразеалагізм метафарызацыі, разбурае яго цэласную семантыку. Успрыманне сінтаксічна аманімічных словазлучэнняў як фразеалагічных і адначасова як свабодных стварае яскравы камічны эфект.

Канкрэтызацыя кампанента іншы раз прыводзіць да дэталізацыі, раскрыцця значэння ўсяго фразеалагізма ў дастасаванні да канкрэтнага выпадку: [Мікола:] *Што сталася, Насця?* ***Якая цябе муха ўкусіла****?* [Насця:] ***Тая****, што*

вы з сабою прывезлі. («Пяюць жаваранкі».) У выніку канкрэтызацыі назоўнікавага кампанента *муха* фразеалагізма *якая муха ўкусіла* (*разм.* 'што здарылася з кім-н., як усё гэта растлумачыць?') указальным займеннікам *тая* гэты фразеалагізм разбураецца: адно і тое ж спалучэнне адзін персанаж (Мікола) ужывае як устойлівае, а другі (Насця) разумее як свабоднае.

Наўмыснае ўжыванне фразеалагічнага кампанента і займеннікавага эквівалента са словамі-канкрэтызатарамі можа выступаць сродкам сатыры: [Дабрыян (чытае далей):] *Зволены за...* [Дажывалаў:] *Не трэба... Няма чаго* ***варушыць брудную бялізну***. [Дабрыян:] *Тым больш, што* ***яе*** *тут досыць шмат.* («Брама неўміручасці».) Фразеалагізм *варушыць брудную бялізну* (*разм. неадабр.* 'праяўляць залішнюю цікавасць да непажаданых падрабязнасцей чыйго-н. асабістага жыцця, узаемаадносін, дзейнасці і пад.') у выніку канкрэтызацыі яго кампанента дэфразеалагізуецца, успрымаецца са свабодным значэннем. Намёк на брудную бялізну, якой *тут досыць шмат*, служыць для выкрыцця былога інтэнданта маёра-пенсіянера Дажывалава, паколькі алегарычна падказвае, за што маёр звольнены з арміі.

3. Супрацьпастаўленне слова свабоднага ўжывання з блізкагучным кампанентам фразеалагізма. Да гэтага тыпу належаць фразеалагічныя каламбуры, пабудаваныя на сутыкненні паранамазаў – аднакаранёвых сугучных слоў (слова свабоднага ўжывання і кампанента фразеалагізма): [Батура:] *Добры дзень, пане стараста! Вы, здаецца, у гміне сягоння былі? Што чуваць на* ***белапольскім****... цьфу, каб на яго ліха!.. на* ***белым свеце****?* («Партызаны».) Каламбур створаны шляхам супастаўлення аднакаранёвых слоў – першай часткі слова свабоднага ўжывання *белапольскі* і кампанента *белы* фразеалагізма *белы свет* ('навакольная рэчаіснасць – сусвет, зямля з усім, што на ёй існуе; жыццё ва ўсіх яго праявах'). Праз такое супастаўленне дасціпна і трапна высмейваецца кулак Маргун, які прадаўся белапольскім акупантам.

Такім жа спосабам будуецца каламбур і ў наступным прыкладзе: [Русаковіч:] *Вось ён – свежы волжскі* ***вецер****! Можа, ён* ***праветрыць мазгі*** *тым, у каго яны заброснелі.* («Зацікаўленая асоба».) Пад уплывам актуалізатара-паранамаза *вецер*, які абыгрываецца з сугучным аднакаранёвым кампанентам *праветрыць*, выраз *праветрыць мазгі* адначасова ўспрымаецца як устойлівы (*праст.* 'гаварыць, дзейнічаць больш разважліва') і як сінтаксічнае словазлучэнне (з аказіянальным значэннем 'асвяжыць галаву'), што выклікае ў чытача камічны эфект.

Камбінаваныя стылістычныя прыёмы. Стылістычныя прыёмы, заснаваныя на абыгрыванні асобных кампанентаў фразеалагізма, могуць ужывацца камбінавана (выкарыстанне пытанняў і адказаў, слова з прамым значэннем, тоеснага кампаненту фразеалагізма і канкрэтызацыя аднаго з кампанентаў). Каламбуры, пабудаваныя на адначасовым выкарыстанні розных прыёмаў, экспрэсіўна больш камічна насычаныя і выразныя, чым тыя, якія ўтвараюцца прыёмамі аднаго тыпу.

1. Выкарыстанне пытанняў і адказаў. Гэта адзін з найбольш пашыраных камбінаваных стылістычных прыёмаў, што маюць дачыненне да кампанента фразеалагізма: [Зёлкін:] *Вы за маю жонку не бойцеся, яна* ***ў*** *добрых* ***руках****.* [Цёця Каця:] *У чыіх жа гэта?* [Зёлкін:] *У маіх, вядома. Во, у гэтых.* [Цеця Каця:] *Ха-ха-ха...* («Хто смяецца апошнім».) Той самы выраз *у руках* дзейныя асобы разумеюць па-рознаму: Зёлкін (першая рэпліка) – як фразеалагізм ('быць у чыім-н. падпарадкаванні'), цёця Каця (другая рэпліка) – як свабоднае словазлучэнне (актуалізатар – пытанне *У чыіх жа гэта?*), Зёлкін (трэцяя рэпліка), мяркуючы па яго адказу (*У маіх, вядома. Во, у гэтых*), – таксама як

свабоднае. У выніку дэфразеалагізацыі фразеалагізма ствараецца каламбур, з дапамогай якога выяўляецца камічнае стаўленне цёці Каці да Зёлкіна.

2. Выкарыстанне ў кантэксце слова з прамым значэннем, тоеснага кампаненту фразеалагізма, і канкрэтызацыя аднаго з кампанентаў: [Камандуючы:] *Значыць, вы* ***наступалі***... [Караневіч:] *...Не маючы дакладных даных аб праціўніку.* [Камандуючы:] *Ну, і* ***наступілі***... *сабаку* ***на хвост***... *А ён кусаецца. Дзе ж вашы вочы былі?* («Проба агнём».) Гэты фразеалагічны каламбур ствараецца адной дзейнай асобай, якая «падхоплівае» ўжытае ў сваёй папярэдняй рэпліцы слова з прамым значэннем *наступілі* ('ведучы актыўныя ваенныя дзеянні, рухаліся наперад'), па-свойму пераасэнсоўвае яго (выкарыстоўвае са значэннем 'ступіць, стаць на каго-, што-н.'), далучае да яго частку фразеалагізма *на хвост*. Удакладняльнае дапаўненне *сабаку*, далучанае да дзеяслоўнага кампанента *наступілі* фразеалагізма *наступілі на хвост* (*праст.* 'наблізіліся да каго-н.'), набывае вобразнае, персаніфікавана-аказіянальнае значэнне, што выклікае ў чытача багатыя асацыяцыі і садзейнічае дэфразеалагізацыі фразеалагізма. Наяўнасць у кантэксце постпазіцыйнага актуалізатара-іранізма (*А ён кусаецца*), ужытага са значэннем 'дае адпор', яшчэ больш узмацняе камічную сітуацыю.

Такім чынам, у п'есах К. Крапівы асноўнымі прыёмамі абыгрывання кампанента фразеалагізма пры пабудове каламбураў з'яўляюцца наступныя: а) выкарыстанне слова з прамым значэннем, агульнага з кампанентам фразеалагізма, б) канкрэтызацыя значэння аднаго ці больш кампанентаў фразеалагізма, в) супрацьпастаўленне слова свабоднага ўжывання з блізкагучным кампанентам фразеалагізма. Стылістычныя прыёмы, якія адносяцца да кампанента фразеалагізма, могуць ужывацца камбінавана (выкарыстанне пытанняў і адказаў, слова з прамым значэннем, тоеснага кампаненту фразеалагізма і канкрэтызацыя аднаго з кампанентаў).

ЛІТАРАТУРА

1. ***Аксамітаў, А.С.*** Функцыянаванне і ўспрыманне фразеалагізмаў у тэксце твораў Якуба Коласа / А.С. Аксамітаў // Роднае слова. – 1996. – № 7. – С. 63–73.
2. ***Лепешаў, І.Я.*** Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І.Я. Лепешаў; рэд. А.Я. Міхневіч. – Мн., 1984. – 264 с.
3. ***Лепешаў, І.Я.*** Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Мн., 1998. – 271 с.
4. ***Лепешаў, І.Я.*** Фразеалогія ў творах К. Крапівы: Стылістычнае выкарыстанне фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мн., 1976. – 152 с.
5. ***Рагаўцоў, В.І.*** Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі / В.І. Рагаўцоў. – Магілёў, 2002. – 304 с.
6. ***Шубадзёрава, А.М.*** Каламбур у мове беларускай драматургіі: аўтарэф. ... дыс. канд. філал. навук: 10.02.01 / А.М. Шубадзёрава / Гомел. дзярж. ун-т. – Гомель, 1998. – 20 с.

S U M M A R Y

This article deals with one of the ways of forming phraseological puns,based on turning into advantage the components of phraseological units, Krapiva s plays being taken as an example.

Поступила в редакцию 30.05.2006